Вернісаж

# НЕБА, ЗЯМЛЯ І ВАДА ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

## У Мінску адкрылася выстава «Род Гомельскі»

«Цэнтр зямлі там, дзе я стаю», — сцвярджаў славуты Несцерка. Сапраўды, мы ведаем шмат прыкладаў, калі таленавіты, грамадска актыўны чалавек, які жыве дзесьці ў глыбінцы, стварае там культурны цэнтр. Недарэмна сёння вялікая ўвага аддаецца культурнаму жыццю рэгіёнаў нашай краіны, у кожным з якіх ёсць непаўторныя таленты. Пра значэнне малой радзімы для творцы гаварылі на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы напярэдадні адкрыцця ў Рэспубліканскай карціннай галерэі «Палац мастацтва» выставы «Род Гомельскі» Гомельскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў.

— Беларускі саюз мастакоў заўсёды намагаецца далучаць да ўсіх вялікіх выстаў і акцый мастакоў з рэгіёнаў, тым болей у структуры саюза ёсць абласныя арганізацыі. Сёння мы гаворым пра Гомельшчыну. Думаю, на далейшых прэс-канферэнцыях мы пагаворым і пра іншыя рэгіёны Беларусі, — адзначыла **намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Ініцыятарамі выставы «Род гомельскі» сталі нашы гомельскія мастакі, якія падрыхтавалі яе яшчэ ў мінулым годзе і нават паспелі паказаць у залах палаца Румянцавых-Паскевічаў. На выставе прадстаўленыя і кераміка, і скульптура, і жывапіс, і графіка, і камп'ютарная графіка пяцідзесяці сямі мастакоў. Для плаката мы выбралі работу гомельскай мастачкі Святланы Наздрын-Платніцкай — яна ўбачыла Гомельшчыну яркай, сонечнай, дзе з'ядноўваюцца тры стыхіі: неба, зямля і вада. Разнастайнасць выставы — гэта і асаблівасць рэгіёна. Гомельшчына — і Палессе, і Ветка з яе ўнікальнай культурай. Там нарадзілася шмат творцаў, якія паўплывалі на фарміраванне мастацтва Беларусі. Згадаем народнага мастака Беларусі Гаўрылу Вашчанку, які адлюстраваў малую радзіму на сваіх палотнах; мастака, доктара мастацтвазнаўства Віктара Шматава, які з вялікім болем




успрыняў чарнобыльскую трагедыю, што закранула яго малую радзіму, і лічыў сваёй місіяй сабраць прадметы мастацтва ў забруджаных раёнах. Мастакі — ураджэнцы Гомельшчыны, той жа Віктар Барабанцаў, паехалі туды пасля чарнобыльскай трагедыі, каб адлюстраваць, што адбываецца.

**Старшыня Гомельскага аддзялення Беларускага саюза мастакоў Леанід ВЯЛІЧКА** адзначыў:

— Знамянальна, што выстава адбываецца ў год 80-годдзя вызвалення Беларусі. Нядаўна Гомельская арганізацыя Беларускага саюза мастакоў арганізавала праект, прысвечаны трагедыі канцлагера Азарычы. У выставе, якая называлася «Чорныя зоры», узялі ўдзел мастакі розных пакаленняў, у тым ліку і шмат маладых.

Леанід Вялічка прыгадаў, што, калі выстава праходзіла ў Светлагорску, падыходзілі сведкі страшных падзей, плакалі, дзяліліся ўспамінамі.

Загадчыца аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст. Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Святлана Кот распавяла пра творы мастакоў Гомельшчыны, якія знаходзяцца ў фондах музея. Вучань Гаўрылы Вашчанкі мастак Леанід Хобатаў згадаў, што дзякуючы сваёму настаўніку зразумеў каштоўнасць малой радзімы.

— Без любові да малой радзімы цяжка гаварыць увогуле на мове мастацтва. Гомельская зямля фантастычная па сваёй прыгажосці, там магутныя жывапісныя рэкі, каля якіх утвараецца асаблівы рэльеф. Гаўрыла Вашчанка якраз і ўбачыў гэты рэльеф і стварыў з яго свой асабісты сімвал. Далучэнне да Айчыны праз малую радзіму, у маім выпадку — праз Рэчыцу, у якой я нарадзіўся, праз Днепр, які разліваецца на шмат кіламетраў, і дае права гаварыць пра нешта вельмі важнае.

Калі казаць пра культуру Гомельшчыны, нельга абысці адлюстраванне ў ёй тэмы чарнобыльскай трагедыі. «Маю маленькую радзіму закапалі ў зямны шар», — вымавіў на прэс-канферэнцыі вядомы мастак Уладзімір Васюк. Яго родны пасёлак, што ў Хойніцкім раёне, апынуўся ў зоне адсялення. Да 20-годдзя чарнобыльскай трагедыі мастак зрабіў памятны знак «Укрыжаваная вёска», на ім надпіс — «Маленькай радзіме ад удзячных жыхароў».

Сын народнага мастака Беларусі Гаўрылы Вашчанкі мастак Канстанцін Вашчанка распавёў пра ўражанні ад сваіх падарожжаў з бацькам па Гомельшчыне, па Прыпяці, Дняпры, пра філасофскі склад розуму тамтэйшых жыхароў. Яшчэ пры жыцці Гаўрылы Вашчанкі Гомельшчына аддала даніну павагі майстру, які апеў яе прыгажосць; у Гомелі была адчынена яго мастацкая галерэя, якой ён падарыў шмат сваіх прац. Нядаўна сын мастака перадаў туды яшчэ частку твораў бацькі.

Выставу «Род Гомельскі» можна ўбачыць у Палацы мастацтва да 25 жніўня.

**Людміла ІВАНОВА.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.22 | 21.09 | 15.47 |
| Віцебск — | 5.06 | 21.04 | 15.58 |
| Магілёў — | 5.12 | 20.59 | 15.47 |
| Гомель — | 5.16 | 20.49 | 15.33 |
| Гродна — | 5.39 | 21.23 | 15.44 |
| Брэст — | 5.46 | 21.17 | 15.31 |

## Месяц

*Апошняя квадра 28 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

***Пр.** Емяльяна, Івана.*
***К.** Алены, Ігната, Любаміра, Рамана.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




# 31 ЛІПЕНЯ

Даты Падзеі Людзі

У краіне



**1802** год — нарадзіўся Ігнат Дамейка (вёска Вялікая Мядзвядка Навагрудскага павета, цяпер — у Мірскім сельсавеце Карэліцкага раёна), беларускі і чылійскі вучоны-даследчык, геолаг, мінеролаг, рэктар Чылійскага ўніверсітэта, Нацыянальны герой Чылі. «Натуральна, перарадзіцца я ніколі не змагу, і спадзяюся на Бога, што я — ці ў Кардыльерах, або ў Вільні — усё роўна памру літвінам...» — пісаў ён Адаму Міцкевічу. Сёння ў яго гонар названы ўніверсітэт і нацыянальная бібліятэка ў Санцьяга; вуліцы ў Санцьяга-дэ-Чылі, Вальпараіса і яшчэ ў васьмі гарадах Чылі, а таксама ў Вільнюсе, Мінску і Навагрудку.

**1920** год — штучна створаная бальшавікамі буферная Літоўска-Беларуская ССР спыніла існаванне, адбылося другое абвяшчэнне БССР.

**1959** год — у г. Маладзечне па рашэнні выканкама Маладзечанскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных быў створаны Маладзечанскі абласны краязнаўчы музей. З 1960 года мае назву — Мінскі абласны краязнаўчы музей. У фондзе музея 35 калекцый, найбуйнейшыя з якіх археалагічная і калекцыя «Клады». У зборах музея зберагаюцца залататканы слуцкі пояс XVIII ст., старадрукі 1646—1789 гадоў друкарняў Кёльна, Нясвіжа, Вільні, Варшавы, Масквы, рукапісныя дакументы XVII ст. на старабеларускай мове і інш. У музеі сабраны калекцыі прылад працы і сялянскага побыту XIX—XX стст., народнага касцюма, ткацтва, івянецкай і радашковіцкай керамікі, барысаўскага крышталя. Музей актыўна праводзіць выставы, лекцыі, заняткі, навукова-практычныя семінары.

**1980** год — нарадзілася Вікторыя Азаранка, беларуская тэнісістка, заслужаны майстар спорту Беларусі.

У свеце

**30** год да н. э. — Александрыйская бітва. Гэта была грамадзянская вайна паміж кіраўнікамі Рымскай рэспублікі за валоданне Егіптам. Фактычна вялася за бязмежнае панаванне ў Рыме. Вайна пачалася з-за незадаволенасці рымскага народа дзеяннямі Марка Антонія (пройгрыш у вайне з Парфіяй, яго шлюб з Клеапатрай), а таксама з-за Цэзарыёна, сына Цэзара ад Клеапатры, які ў абыход Аўгуста мог быць наследнікам Цэзара. Пры гэтым Актавіян Аўгуст жадаў кіраваць аднаасобна.

**1914** год — нарадзіўся Луі дэ Фюнес, французскі камедыйны акцёр. Здымаўся ў фільмах «Вялікі шпацыр», «Жандар з Сен-Трапе», «Разявака», «Фантамас» і іншых. Як адзначаюць кінакрытыкі, гэта акцёр, якому няма замены і па сённяшні дзень.

**1919** год — у Германіі прынята Веймарская канстытуцыя, якая аформіла замену паўабсалютысцкай манархіі буржуазна-дэмакратычнай парламенцкай рэспублікай, што адбылася ў выніку Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 года.

Так гаварыў...

**КАРЛ СЕНДБЕРГ:**

*«Мёртвыя працягваюць валодаць толькі тым, што яны аддалі».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Захварэў ветэрынар, які раней ніколі не хварэў. Прыходзіць да тэрапеўта. Сядзяць пяць хвілін моўчкі, глядзяць адно на аднаго.**

**Тэрапеўт: «Ну, на што скардзіцеся?»**

**Ветэрынар: «Афігець! Як у вас усё проста!»**

— Будуць у тваім жыцці і ўзлёты, і падзенні, і поспехі, і расчараванні. Але памятай, сынок, самае галоўнае — як бы ні склаўся твой лёс, у якія б абставіны ты ні трапіў, пры любым раскладзе трэба заставацца чалавекам! Хітрым, каварным, бязлітасным стварэннем!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.119. Індэкс 63850. Зак. № 1649.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 ліпеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12